**Міхась Белямук**
(Кліўленд)

## Пячатка князя Аляксандра Цьвярскога і пячаткі князёў Гедымінавічаў

У Цьвер прыехаў Шэквал, братаніч татарскага хана Узбека. Зь ягоным прыездам у Цьвяры пачалося „насилие творитися”, што прывяло да паўстаньня 15 жніўня 1327 г. У выніку татары былі перабіты, а татарскі княжыч Шэквал спалены. Паўстаньне ў Цьвяры паслужыла нагодаю маскоўскаму князю Івану Данілавічу Каліце атрымаць дапамогу ад хана Узбека — 50 тысяч вояў. Ён цяпер рашыў расправіцца з сапернікам князем Аляксандрам Міхайлавічам Цьвярскім. Упэўнены ў перамозе, Іван Каліта рушыў на Цьвер са 100 000 арміяй вояў. Князь Аляксандар Міхайлавіч зразумеў, што ня мае сілаў супрацьстаяць маскоўскаму князю. Таму ён забраў жонку, дзяцей і верных баяраў ды паехаў у Пскоў. Псковічы добра ведалі цьвярскія падзеі, яны прынялі князя Аляксандра, прысягнулі яму і „крест целоваша, что его не выдати князем руским”[1].

Іван Каліта, гнаны прагаю помсты, падышоў да Ноўгарада. Тым часам пасланцы Каліты прыбылі Пскоў з патрабаваньнем, каб князь Аляксандар ехаў у Арду на суд да хана Узбека. Аляксандар ня быў наіўным і добра ведаў, што яго чакае ў Ардзе. Аднак ён разважаў, што лепш памерці яму аднаму, чымсьці губіць „крестианы” (хрысьціянаў-псковічаў). Але-ж верныя Аляксандру псковічы склікалі веча і пастанавілі цьвёрда стаяць за князя Аляксандра. Яны ня радзілі яму ехаць у Арду, абяцаючы „оже что будеть на тобе, изомрем, господине, с тобою во одином месте”[2].

Князь Аляксандар Міхайлавіч супакоіўся, паверыўшы псковічам. Калі пастанова пскоўскага веча дайшла да маскоўскага князя Івана Каліты, дык той занепакоіўся, бо ведаў ваяўнічасьць і мужнасьць пскоў-

[1] *Псковские летописи*, вып. 1, под редакцией А. Н. Насонова, Москва — Ленинград 1941, с. 16-17.
[2] *Псковские летописи*, вып. 2, под редакцией А. Н. Насонова, Москва 1955, с. 91.

скіх вояў. Таму пачынаць бойку з такімі адважнымі воямі был рызыкоўна. Князь Іван Данілавіч вырашыў парадзіцца з хітрым грэкам мітрапалітам Феагностам. Мітрапаліт парадзіў маскоўскаму князю выкарыстаць не вайсковы, але духоўны меч. „И посла митрапалит во Псков проклятие и отлучение на князя Александра и на весь Псков[3]".

Анафема мітрапаліта (дарэчы, першая ў Русі) занепакоіла Аляксандра. Ён зьвярнуўся з прамовай да пскоўсага веча: „Братия моя и друзи мои, не буди на вас проклятиа ни отлучениа мене ради, еду из града вашего вон"[4].

Князь Аляксандар падзякаваў псковічам за прытулак, за іх мужнасьць і папрасіў заапекавацца ягонымі жонкай і дзяцьмі. Сам прыблізна ў лістападзе 1329 году, разьвітаўшыся, пакінуў Пскоў. Пскоўскі летапісец журботна піша: „Тогда бяшеть во Пскове туга и печаль и молва многа по боголюбивом князи Александре"[5].

Пасьля ад'езду князя Аляксандра, псковічы паслалі паслоў да маскоўскага князя Івана Данілавіча зь весткай, што Аляксандра ў Пскове няма. Іван Каліта зрабіў выгляд, што задаволены весткай і пагадзіўся аднавіць мірны дагавор з псковічамі, а мітрапаліт Феагност згадзіўся зьняць свой праклён і адлучэньне з псковічаў.

Князь-жа Аляксандар, каторы стаўся „изгоем", выгнаньнікам са свайго Цьвярскога княства, знайшоў прытулак у князя Гедыміна. Пісьмовыя крыніцы не паведамляюць пра ягонае жыцьцё ў Вялікім Княстве Літоўскім, але можна прыпушчаць, што вялікі князь Гедымін сустрэў Аляксандра прыхільна, бо Аляксандар даводзіўся Гедыміну сваяком. Ягоны старэйшы брат Дзьмітры быў пашлюбаваны з дачкою Гедыміна Марыяй, але 15 верасьня 1325 году князь Дзьмітры быў закатаваны ў Ардзе. Князь Аляксандар пражыў у Літве 18 месяцаў і ў канцы травеня 1331 году вярнуўся ў Пскоў. Псковічы былі вельмі рады прыезду князя Аляксандра, „прияша его с честию и посадиша его во Пскове на княжении"[6].

Паколькі Пскоў падпарадкоўваўся ноўгарадзкаму архіепіскапу, Аляксандар і Гедымін вырашылі сьпярша ўнезалежніць Пскоў рэлігійна, а затым ужо палітычна — прымацаваць яго да Вялікага Княства Літоўскага. Выкарыстоўваючы нагоду прыезду мітрапаліта Феагноста ва Уладзімер-Валынскі, яны восеньню 1331 году паслалі пасольства з просьбаю хіратанізаваць манаха Арсенія ў епіскапа пскоўскага. Мажліва іх просьба была-б задаволена, каб ва Уладзімер-Валынскі не зьявіўся ноўгарадзкі ўладыка Васіль, які супрацівіўся хіратоніі Арсенія, даказваю-

3 Там-жа, с. 91.
4 Там-жа, с. 91.
5 Там-жа, с. 91.
6 Там-жа, с. 92.

чы, што ў Пскове ніколі не было епіскапа, што Пскоў належыць да Ноўгарадзкай епархіі. Гэткія доказы, мабыць, паўплывалі на мітрапаліта Феагноста, і ён адмовіўся „поставити во Псков своего им епископа[7]”.

Ноўгарадзкі летапісец адзначыў, дакараючы псковічам: „изменили крестное целование к Новуграду, посадили собе князя Александра из литовскыя руки”[8].

Гэтая летапісная інфармацыя сьведчыць, што Пскоў стаў падпарадкоўвацца літоўскаму вялікаму князю Гедыміну.

Да 1331 году князь Аляксандар карыстаўся пячаткай, на якой быў вобраз сьвятога воіна Аляксандра ў поўны рост зь дзідай і шчытом. На другім баку пячаткі — Хрыстос на троне. Пячатка зьбераглася пры дагаворы Ноўгарада з князем Аляксандрам з 1326-1327 году[9].



Пасьля 1331 году наступіла зьмена эмблемы на пячатцы князя Аляксандра. Беручы пад увагу паведамленьне ноўгарадзкага летапісца, што князь Аляксандар стаў пскоўскім князем „из литовскыя руки”, можна меркаваць, што вялікі князь Гедымін быў ягоным сюзэрэнам і, пасылаючы Аляксандра ў Пскоў, даручыў яму зрабіць пячатку зь літоўскай эмблемай — рыцар-князь на кані зь мячом. На адваротым баку пячаткі ён зьмясьціў надпіс: „Печать княжа Олександрова”[10].



Такія пячаткі знойдзены падчас археалагічных раскопкаў Пскова

[7] *Патриаршая или Никоновская летопись*, [у:] *Полное собрание русских летописей* (далей: *ПСРЛ*), т. X, Москва 1965, с. 205.

[8] *Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов*, Москва — Ленинград 1950, с. 343.

[9] В. Л. Янин, *Актовые печати древней Руси X-XV вв.*, т. 2, Москва 1970, с. 163, № 405; с. 308, № 405.

[10] С. В. Белецкий, *Печать княжа Олександрова*, „Советская археологня”, Москва 1985, № 3, с. 231.

ў 1962 і 1972 гадах. Археалог і гісторык Пскова С. В. Бялецкі сабраў інфармацыі пра Аляксандраў, што княжылі ў Пскове ў XIV- XV ст.ст. Прааналізаваўшы іх побыт у горадзе, ён прыйшоў да высновы, што толькі князь Аляксандар Міхайлавіч Цьвярскі мог быць уласьнікам гэтых пячатак. На думку С. Бялецкага, выява „литовского всадника” на пячатцы Аляксандра „связана с политическим альянсом” князя Аляксандра Міхайлавіча зь вялікім князем літоўскім Гедымінам[11].

Гэтак князь Аляксандар, знайшоўшы пытулак і абарону ў Вялікім Княстве Літоўскім, стаўся васалам вялікага князя Гедыміна і выканаў пажаданьне свайго сюзэрэна, зьмясьціўшы на пячатцы літоўскую эмблему вялікага князя Гедыміна.

Гэткую-ж сытуацыю маем у 1333 годзе, калі Ноўгарад быў у неладзе з маскоўскім князем Іванам Данілавічам Калітой. Тады Ноўгарад ня толькі паміраўся з псковічамі й іхным князем Аляксандрам, але папрасіў вялікага князя Гедыміна прыслаць ім ягонага сына Нарымунта-Глеба князем у Ноўгарад[12].

Гедымін, пасылаючы Глеба ў Ноўгарад, даручыў яму зрабіць пячатку, па нашым меркаваньні, з Гедымінавай эмблемай. Пракняжыў Глеб два гады. Паколькі Ноўгарад паміраўся зь Іванам Калітой, то ў 1335 годзе прыйшлося князю Глебу пакінуць Ноўгарад і пераехаць на княжаньне ў Полацак. Там ён з полацкім епіскапам Грыгорам прывесіў пячатку да гандлёвага дагавору з Рыгай, не раней лістапада 1338 года. На пячатцы Глеба на адным баку была тая самая эмблема, якая была на ноўгарадзкай пячатцы — рыцар-князь на кані зь мячом, а на другім баку надпіс: „Печать княжа Глебова”[13].





Паводле Мар'яна Гумоўскага, вялікі князь Гедымін прывесіў у 1323 годзе маестатную пячатку да ліста папы Яна XXII. Пячатка не зьберагглася, яна вядомая з апісаньня. На ёй выява князя на троне зь мітрай на галаве. Па пэрымэтры пячаткі — лацінскі надпіс: + S. DEI GRACIA GEDEMINI LETHVINORVM ET RVTHENOR REG[14].

[11] Там-жа, с. 239.

[12] *Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов*, с. 345-346.

[13] *Полоцкие грамоты XIII — начала XVI вв.*, Москва 1977, с. 39-42; А. Цітоў, *Пячаткі старажытнай Беларусі*, Мінск 1993, с. 33.

[14] M. Gumowski, *Pieczęcie książąt litewskich*, „Atheneum Wileńskie”, R. VII, zeszyt 3-4, s. 606.

Наша меркаваньне, што вялікі князь Гедымін мог мець, апрача маестатнай пячаткі, іншую пячатку. Паколькі пячаткамі з эмблемай рыцар-князь на кані карысталіся князі Аляксандар у Пскове, а Нарымунт-Глеб у Ноўгарадзе і ў Полацку, то верагодна, што вялікі князь Гедымін меў такую-ж пячатку. Атрымаў ён яе ў спадчыну ад вялікага князя Віценя (1295-1316) , бо Віцень: **„измысли себе герб и всему княству Литовскому печать: рыцер збройны на коне з мечом..."**[15].

Гэтая спадчынная пячатка рэпрэзантавала вялікага князя Гедыміна, і ягоныя сыны ня мелі права ўжываць эмблему рыцар-князь на кані без дазволу вялікага князя. Сын ягоны Альгерд пасьля сьмерці Гедыміна, са згодаю Кейстута, які быў ягоным братам, стаўся вялікім князем і прывесіў пячатку з эмблемай рыцара-князя на кані зь мячом да мірнага трактату з польскім каралём Казімерам у 1366 годзе. Пры трактаце, апрача пячаткі Альгерда, была пячатка князя Кейстута, з эмблемай пешага рыцара-князя зь мячом і шчытом, хаця браты супольна кіравалі дзяржавай, Вялікім Княствам Літоўскім, але яны мелі розныя пячаткі. Дакумэнт перахоўваўся ў польскім дзяржаўным архіве і Тадэвуш Чацкі (1765-1813) бачыў яго і распазнаў пячаткі. Праз некалькі год пазьней, калі Адам Нарушэвіч (1733-1796) аглядаў дакумэнт, то заўважыў, што пячатка Алгерда скрышылася[16].

Ягайла па спадчыннасьці стаўся вялікім князем. Разам з князем Кейстутам 29 верасьня 1379 году заключылі дагавор з крыжацкім магістрам Вінрыкам. Да дагавору прывесілі пячаткі. На пячатцы вялікага князя Ягайлы — эмблема — рыцар-князь на кані зь мячом, а на пячатцы троцкага князя Кейстута — эмблема пешага рыцара-князя са шчытом і мячом.





*Пячатка Ягайлы* *Пячатка Кейстута*

У хуткім часе, прыблізна ў 1382 годзе, узнікла непаразуменьне паміж вялікім князем Ягайлам і князем троцкім Кейстутам. Гэтае непаразуменьне закончылася трагічна, бо князь Кейстут і ягоны сын Вітаўт былі схоплены і пасаджаны ў Крэўскі замак, дзе Кейстута закатавалі,

[15] *Густынская летопись*, [у:] *ПСРЛ*, т. 2, Санкт-Петербург 1843, с. 346.

[16] T. Czacki, *O litewskich i polskich prawach, o ich duchu, źródłach, związku i rzeczach zawartych w 1-ym Statucie dla Litwy w 1529 roku wydanym*, Kraków 1861, t. 1, s. 81-82; M. Gumowski, *Pieczęcie książąt litewskich...*, s. 709-710.

а Вітаўту пашчасьціла ўцячы. Вітаўт вырашыў змагацца зь вялікім князем Ягайлам. Ён уцякае да крыжакоў і 30 студзеня 1384 году да крыжацкай умовы прывесіў пячатку з эмблемай рыцар-князь на кані зь мячом. Такая-ж эмблема была на пячатках князя Аляксандра Цьвярскога, князя Нарымунта-Глеба, на пячатках вялікіх князёў Гедыміна, Альгерда і Ягайлы. На пячатцы князя Вітаўта быў надпіс: + SIGILVM WITAWT DVCIS TRACKEN.



Але як зьявілася эмблема рыцар-князь на кані зь мячом, і каго яна сымбалізавала? Вернемся ў часы, калі ў Полацку княжыў Воін, які па меркаваньнях адных дасьледчыкаў — брат Віценя[17], паводле іншых — сын Віценя[18].

Полацкае княства ў час княжаньня Воіна было незалежным. Палачане ганарыліся сваім вечам, сваёй 300-гадовай гісторыяй, сваім славутым князем Усяславам Брачыславічам, сваёй вядомай сьвятой Еўфрасіньняй і яе праваслаўнай рэліквіяй — сьвятым крыжам. Князь Воін як полацкі князь мог падзяляць гэтыя пачуцьці палачан. Ён аглядаў велічны Сафійскі сабор, збудаваны князем Усяславам, дзесяткі мураваных цэркваў, манастыры, у якіх манахі і манахіні ня толькі маліліся, але перапісвалі кнігі, апекаваліся хворымі і сіротамі —дзяцьмі. У слаўнай бібліятэцы Сафійскага сабору мог прачытаць паэму *Слова аб паходзе Ігаравым*, у якой услаўляўся легендарны полацкі князь Усяслаў Брачыславіч, якога людзі назвалі Чарадзеем. На нашу думку, князь Воін, усьведамляючы слаўную гісторыю Полацка і яго культурны ўзровень, мог прапанаваць вялікаму князю Віценю, свайму бацьку, зрабіць пячатку з эмблемай полацкага князя Усяслава і такім чынам прымацаваць Полацак да панёманскага Наваградка, які пачынаў узыходзіць як новая сталіца Вялікага Княства Літоўскага. Вялікі князь Віцень, паслухаўшы параду сына і ацаніўшы яе сутнасьць, згадзіўся рэалізаваць ідэю Воіна.

[17] *Живописная Россия*, т. 3, Минск 1993, с. 295; *Genealogia*, Warszawa 1959, tablica 15.

[18] *Нарысы гісторыі Беларусі*, Мінск 1994, ч. I, с . 484-485; *Беларуская Энцыклапедыя*, Мінск 1997, т. 4, с. 255; т. 5, с. 131.

Паколькі дваюрадныя браты памірыліся і князь Вітаўт уцёк ад крыжакоў, ён прывесіў пячатку з эмблемай рыцар-князь на кані зь мячом ня толькі да крыжацкай умовы, але да дакумэнту аб Крэўскай вуніі. Гэта сьведчыла аб прызнаньні права, што ўнукі вялікага князя Гедыміна могуць ужываць пячатку з эмблемай рыцар-князь на кані зь мячом. А паколькі Вітаўт на пячатцы затытулаваў сябе князем троцкім і прывесіў пячатку да Крэўскага акту, то, зразумела, вялікі князь Ягайла бессумніўна вярнуў князю Вітаўту бацькавыя Трокі. Калі-б было інакш, то Вітаўту не дазволілі-б прывесіць пячатку да Крэўскага акту.

Пасьля каранацыі вялікага князя Ягайлы ў Кракаве 4 сакавіка 1386 году ад князя Вітаўта Трокі адабралі, пакінуўшы яму Горадню, і прымусілі зрабіць новую пячатку з той самай эмблемай, але іншай тытулятурай : + S. VITOLDI . DVCIS . LITWANIE . ET . DEI . GRODEN .



Паколькі Гедымінавічы пачалі карыстацца пячаткай з эмблемай рыцар-князь на кані зь мячом, то кароль Ягайла зрабіў сабе маестатную пячатку з шасьцю гербамі правінцыяў каралеўства Польшчы і гэрбам Вялікага Княства Літоўскага. Гэтую пячатку прывесіў да прывілеі каталіцкім пралатам і баронам польскага каралеўства ў 1386 годзе.



Што-ж на гэтай маестатнай пячатцы годнае ўвагі? Ранейшыя пячаткі з эмблемай рыцар-князь на кані зь мячом шчыта ня мелі. Цяпер эмблема рыцыр-князь на кані атрымала шчыт з праваслаўным шасьцікановым крыжам. Мы мяркуем, што сталася гэта не прыпадкова. Маці караля Ягайлы — Юльляна, дочка князя Аляксандра Цьвярскога, была праваслаўнай. Сам Ягайла ў маладосьці быў хрышчаны па праваслаўным абрадзе, меў імя Якаў. У Полацку знаходзілася рэліквія — крыж са сьвятымі мошчамі, шанаванымі ня толькі праваслаўнай царквой, але

таксама каталіцкай. Крыж гэты быў зроблены ў 1161 годзе стараньнем князёўны-манашкі Еўфрасіньні. Сама Еўфрасіньня прызнаецца сьвятой як праваслаўнай, так і каталіцкай царквой. Таму польская каталіцкая ерархія супраціву не рабіла.

За караля і вялікага князя Ягайлы збройны рыцар-князь на кані атрымаў шчыт зь еўфрасіньнеўскім крыжам і стаўся гэрбам Вялікага Княства Літоўскага. Крышку пазьней гэрб гэты атрымаў назоў „Пагоня".